# Гімн школы

Словы М.Кутаса
Музыка Н.Кутас

Мы ўсе,Беларусь,твае дзеці,
Нашчадкі Скарынавых спраў.
А лепшае месца на свеце-
Дзе першы званок прагучаў.

*Прыпеў*:
Родная школа, а мы –маладыя
З кнігай сябруе вучнёўскі наш гурт.
Родная школа – два словы святыя
Для тых, хто вучыцца тут.

Настаўнікі – нашы дарадцы,
І што ні ўрок – адкрыццё,
А цяжкасцяў нам не збаяцца:
Мы песняй вітаем жыццё.

*Прыпеў.*

І кожны ў нас – малайчына!
Спяшаемся мы з класа ў клас.
Хай славіцца наша Айчына,
І збудуцца мары ў нас.

*Прыпеў.*

Нам школай сваёй ганарыцца!
Так весела крочыць сюды!
А вырасцем – будуць нам сніцца
І клікаць дзяцінства гады.